УДК 811.161.3’276.6 (072)+378.147

# Некаторыя прыёмы фарміравання прафесійнай маўленчай кампетэнцыі студэнтаў тэхнічнай ВНУ (з вопыту заняткаў па дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” са студэнтамі архітэктурных і дызайнерскіх спецыяльнасцей)

А.П. Сахончык, Л.А. Гіруцкая
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Сучасная тэорыя і практыка (методыка) навучання беларускай мове падразумяваюць усвядомленае асэнсаванне моўных адзінак, авалоданне моўнымі нормамі, засваенне законаў і правіл уключэння разнастайных канструкцый у кантэкст звязнай мовы, у выніку чаго авалоданне сістэмнымі ведамі, разуменне асаблівасцяў узаемадзеяння моўных сродкаў розных узроўняў мовы, спецыфікі іх рэалізацыі ў вуснай і пісьмовай формах маўлення набываюць асаблівае значэнне пры навучанні дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”. Праграма дысцыпліны прадугледжвае набыццё навыкаў рацыянальных і эфектыўных моўных паводзін у разнастайных сітуацыях прафесійных і дзелавых зносін; эфектыўнага карыстання моўнымі сродкамі беларускай мовы ў практычнай дзейнасці. Такім чынам, вывучэнне курса з’яўляецца неад’емным элементам фарміравання прафесійнай кампетэнцыі спецыялістаў і асновай для набыцця маўленчага вопыту ў розных сферах зносін.

Кампетэнцыя ў перакладзе з латыні – гэта кола пытанняў, у якіх хто-небудзь добра дасведчаны, валодае пазнаннем, вопытам. Гэта сукупнасць узаемазвязаных якасцей асобы (ведаў, уменняў, навыкаў, спосабаў дзейнасці) у дачыненні да пэўнага кола прадметаў і працэсаў, неабходных для якаснай прадуктыўнай дзейнасці ў адносінах да іх.

Тэрмін “моўная кампетэнцыя” як поўнае веданне роднай мовы, якое дазваляе ідэальнаму суб’екту, які гаворыць-слухае, меркаваць аб правільнасці і асэнсаванасці выказванняў, быў прапанаваны амерыканскім лінгвістам Ноамам Хомскім у сярэдзіне 50-х гадоў XX стагоддзя. Гэтае веданне апісвае граматыка, якая складаецца з набору правіл для рэгуляцыі параджэння ўсіх магчымых у дадзенай мове структур сказаў шляхам трансфармацыі зыходнай канструкцыі, а таксама апісанне ўласна граматычных зносін у саміх сказах і паміж імі. У канцэпцыі Хомскага тэорыя і практыка раздзеленыя: на яго думку, сістэма ўяўленняў аб граматыцы мовы дадзена чалавеку ад нараджэння, уласцівая яму як “біялагічнаму віду”. Уяўленні ж гэтыя залежаць ад месца жыхарства, жыццёвага вопыту, навакольнага асяроддзя і г.д. [3].

Паколькі ў сучаснай методыцы і дыдактыцы навучання мовам пад тэрмінам *моўная кампетэнцыя* разумеюць, як правіла, сукупнасць канкрэтных навыкаў і ўменняў, то відавочна, што “прыжыўся” сам тэрмін, а не аўтарскае яго тлумачэнне. А агульнага меркавання аб тым, што трэба разумець пад моўнай кампетэнцыяй, спецыялісты не маюць.

Мы зыходзім з таго разумення, што маўленчая кампетэнцыя разам з моўнай (лінгвістычнай) уваходзіць у склад камунікатыўнай кампетэнцыі і абазначае веданне спосабаў фарміравання і фармулявання думак з дапамогай мовы і здольнасць карыстацца мовай у маўленні. Некаторыя даследчыкі называюць гэты від кампетэнцыі сацыялінгвістычнай для падкрэслівання неабходнасці ўмення выбіраць патрэбныя моўныя формы і спосабы іх выражэння ў залежнасці ад умоў маўленчага акта (сітуацыі і камунікатыўных задач моўцы). Сфарміраванасць маўленчай кампетэнцыі праяўляецца ў свабодным валоданні асноўнымі відамі маўленчай дзейнасці (вуснай, пісьмовай, сітуацыйнай і

г.д.), навыкамі інтэлектуальнай дзейнасці ва ўмовах інфармацыйнай эпохі.

На нашу думку, вывучэнне дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка” студэнтамі малодшых курсаў робіць практычна немагчымым выкананне прадугледжанай тыпавой праграмай дысцыпліны задачы фарміравання прафесійнай кампетэнцыі спецыялістаў, бо першакурснікі не толькі не валодаюць тэрміналогіяй сваёй спецыяльнасці, а ўвогуле не маюць рэальнага, канкрэтнага ўяўлення аб будучай прафесійнай дзейнасці. Менавіта з гэтых прычын ва ўмовах нашай ВНУ фарміраванне навыкаў маўленчай кампетэнцыі ў розных сітуацыях будучай практычнай дзейнасці можа быць рэалізавана ў першую чаргу на занятках са студэнтамі архітэктурных і дызайнерскіх спецыяльнасцей.

Па-першае, узровень валодання беларускай мовай студэнтамі вышэйназваных спецыяльнасцей, як правіла, вышэйшы за сярэдні, што тлумачыцца агульнагуманітарнымі схільнасцямі і выхаваннем у інтэлігенцкім асяроддзі. Па-другое, менавіта гэтыя студэнты выказваюцца за павелічэнне колькасці гадзін на вывучэнне беларускай мовы, за арганізацыю факультатыўных заняткаў па ёй з мэтай больш свабоднай і шырокай беларускамоўнай камунікацыі. Яны прымаюць актыўны ўдзел у конкурсах творчых работ на беларускай мове, вылучаючыся крэатыўным падыходам да раскрыцця прапанаванай тэмы. Некаторая частка студэнтаў-архітэктараў з’яўляецца беларускамоўнай ці імкнецца да гэтага, карыстаючыся павагай аднакурснікаў і ў нейкай ступені задаючы “моду на беларускасць” у асяроддзі нацыянальна арыентаванай моладзі. Адзначым, што штуршком для “павароту” да роднай мовы такіх студэнтаў нярэдка з’яўляюцца кантакты з заходнееўрапейскай моладдзю падчас міжнародных конкурсаў, студэнцкіх абменаў і пад., калі яны пры правядзенні разнастайных мерапрыемстваў

аказваліся няздольнымі прэзентаваць сваю краіну на мове тытульнай нацыі.

Рэалізацыя задачы фарміравання прафесійнай маўленчай кампетэнцыі не павінна абмяжоўвацца толькі вывучэннем тэм, звязаных з прафесійна-тэрміналагічнай лексікай. Так, на занятках па тэме “Месца беларускай мовы ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей” студэнтам можна прапанаваць выкананне наступных заданняў:

*1. Прачытайце фрагменты з публіцыстычнага твора З.Бядулі “Дзесяць загадаў для памяці” (1922), паразважайце над узнятай праблемай. Складзіце кароткую прамову па абранай тэме. Дакажыце, што гэта тэкст. Прааналізуйце моўныя сродкі, якія забяспечваюць звязнасць і адзінства тэксту, вызначце яго стыль, тып, мэтанакіраванасць і адрасата.*

*2. Напішыце невялічкі ліст да свайго сябра з абгрунтаваннем свайго погляду на гісторыю, лёс, значэнне і перспектывы роднай мовы. Скарыстайце мадэлі моўнага этыкету. Вызначце характэрныя для беларускай мовы рысы, якімі яна адрозніваецца ад іншых славянскіх моў.*

Пры вывучэнні тэмы “Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму” прапануецца інсцэніроўка наступнай маўленчай сітуацыі:

*(Групавое заданне) Уявіце, што вы з аднагрупнікамі знаходзіцеся каля якой-небудзь славутай мінскай мясціны. Вы прыезджыя і хочаце атрымаць ад мінчан інфармацыю аб тым, што бачыце. Складзіце палілог: прыдумайце пытанні, магчымыя адказы, рэплікі. Прачытайце палілог па ролях. Прааналізуйце вуснае маўленне, выпраўце памылкі. Ці сустрэліся сярод памылак інтэрферэнцыйныя? Ці не гучала трасянка?*

Шырокія магчымасці для развіцця маўленчай камунікацыі і тэксту як дыскурсу дае знаёмая студэнтам па школьнай

праграме тэма “Функцыянальныя стылі сучаснай беларускай мовы”. Магчымыя заданні:

1. *Складзіце тэкст запрашэння студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў БНТУ на выставу (конкурс відэаролікаў і пад.), звязаную з вашай спецыяльнасцю.*

*2. Уявіце, што вы – удзельнік конкурсу (праектаў, звязаных са спецыяльнасцю). Складзіце і запішыце сціслае рэкламнае паведамленне. Да якога тыпу маўлення належыць ваш тэкст? Вызначце яго стылістычныя асаблівасці. Наколькі эфектыўныя для рэалізацыі задачы ўжытыя вамі моўныя сродкі? Абгрунтуйце іх мэтазгоднасць. Трансфармуйце ваш тэкст у тэкст навуковага стылю. Параўнайце, зрабіце высновы.*

3. *Уявіце сябе ў ролі экскурсавода і інсцэніруйце маўленчую сітуацыю. Прадэманструйце сваю лінгвакраязнаўчую кампетэнтнасць, жэстава-мімічныя паводзіны і адрэдагуйце ў залежнасці ад сітуацыі.*

Вывучаючы жанры навуковай літаратуры, для фарміравання цэласнага ўяўлення аб будучай прафесійнай дзейнасці, набыцця прафесійнага і сацыяльнага вопыту, у тым ліку пры прыняцці індывідуальных і калектыўных рашэнняў, з мэтай развіцця як тэарэтычнай і практычнай свядомасці ў прафесійнай сферы, так і пазнавальнай матывацыі студэнты з педагагічнымі схільнасцямі могуць паспрабаваць рэалізаваць сябе ў якасці выкладчыка спецыяльных дысцыплін (у каледжы, ва ўніверсітэце) і распрацаваць з гэтай мэтай кароткую лекцыю. Аўдыторыя павінна прааналізаваць выступленне студэнта-выкладчыка па наступных крытэрыях:

- Тэма, мэта, змест.

-Лагічнасць выкладу, навуковасць, доказнасць і аргументаванасць, наяўнасць пераканаўчых прыкладаў, фактаў, эмацыйнасць выкладання, пастаноўка пытанняў.

- Культура маўлення.

Замацаванне і актывізацыя прафесійна-тэрміналагічнай лексікі паспяхова адбываецца пры выкананні наступнага задання:

*Падрыхтуйце прэзентацыю “Праект маёй мары” (5-7 хвілін). У тэксце выдзеліце тэрміны, дайце ім характарыстыку: паводле будовы, паводле паходжання, паводле спосабу ўтварэння.*

Зразумела, што на працягу семестра студэнты атрымліваюць індывідуальныя заданні і выступаюць з паведамленнямі на гістарычна-лінгвістычныя і агульнакультурныя тэмы, што вядзе да павышэння інтэлектуальнага ўзроўню студэнтаў, садзейнічае актывізацыі іх пазнавальных магчымасцей.

Такім чынам, развіццё як маўленчых, так і інтэлектуальных здольнасцяў навучэнцаў, а таксама выпрацоўка практычных уменняў і навыкаў інтэрпрэтацыі камунікатыўнага плана тэкстаў розных стыляў, тыпаў і жанраў садзейнічаюць павышэнню агульнага моўнага, маўленчага і прафесійнага развіцця будучых спецыялістаў і ўдасканаленню іх маўленчага вопыту ў розных сферах зносін, у тым ліку і ў прафесійнай.

**Літаратура**

1. Беларуская мова (прафесійная лексіка): тыпавая вучэб.праграма для выш.навуч. устаноў / склад. М.Р. Прыгодзіч, Г.І. Кулеш, Н.П. Лобань; пад рэд. М.Р. Прыгодзіча. – Мінск: РІВШ, 2008. – 28с.

2. Божович, Е.Д. Процессы интерпретации и различения школьниками синтаксических конструкций / Е.Д. Божович // Психологические исследования. – 2014. – Т. 7, № 35. – С. 3. URL: http://psystudy.ru (дата обращения: 19.10.2014).

3. Хомский, Н. Язык и проблемы знания / Н. Хомский // Вестник МГУ Филология. – 1995. – №4. – С. 130-157.

4. Шандроха, Н.Э. Маўленчая кампетэнцыя студэнта як складнік яго духоўнай культуры ва ўмовах беларуска-рускага двухмоўя / Н.Э. Шандроха // Тыпалогія ўзаемасувязей беларускай і рускай моў і праблемы нацыянальнай самаідэнтыфікацыі: матэрыялы рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 19-20 красав. 2011 г./ уклад. Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы НАН Беларусі. – Мінск: Права і эканоміка, 2011 . – С.346-350.